# МАКСІМ ТАНК

З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, —
Ты выткана, дзіўная родная мова.

*(„Родная мова“, 1943)*



Іх цалавала зямля
Сваімі пясчанымі вуснамі
І каласамі;
Неба спякотай, вятрамі, дажджамі
Іх цалавала.
. . . . . . . . . . .
Толькі заўсёды,
Як мы зберымося дамоў
І на стол пакладзе рукі маці,
Быццам ад сонца, ад іх пасвятлее ў хаце
І ў сэрцы.

*(„Рукі маці“, 1951)*

## АСНОЎНЫЯ ДАТЫ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ

| | |
|---|---|
| 1912 г. | 17 верасня ў вёсцы Пількаўшчына, што на Мядзельшчыне, у сялянскай сям'і нарадзіўся Яўген Скурко. |
| 1914—1915 гг. | У пачатку першай імперыялістычнай вайны бацьку забралі ў салдаты. Калі наблізіўся фронт, маці з Яўгенам падаліся ў бежанцы. У Пскове сустрэліся з бацькам, а неўзабаве ўсе трое пераехалі ў Маскву. |
| 1919—1922 гг. | Яўген ходзіць у адну з маскоўскіх школ. Маці з бацькам усё часцей і часцей гавораць пра Пількаўшчыну, успамінаюць блізкіх і знаёмых. |
| 1922 г. | Сям'я вярнулася на радзіму, якая была пад уладай польскіх паноў. |
| 1923—1926 гг. | Падвучыўшыся ад бацькі чытаць па-польску, Яўген паступае ў Шкленікоўскую школу, затым пераходзіць у Сват-каўскую. Скончыўшы школу, хлопец едзе ў гімназію. |
| 1926—1932 гг. | Разам з адукацыяй, што набываецца ў Вілейскай рускай, Радашковіцкай і Віленскай беларускіх гімназіях, на тэхніка-меліярацыйных курсах, у Віленскай рускай гімназіі, Яўген атрымлівае палітычную падрыхтоўку. Камсамол, удзел у вучнёўскай забастоўцы, падпольная работа па даручэнню КПЗБ, выступленні ў падпольным друку — усё гэта выпрацоўвае палітычную свядомасць юнака. За грамадскай дзейнасцю Яўгена Скурко пачынае сачыць польская сакрэтная паліцыя. |
| 1932—1934 гг. | Арышты, а за імі і турмы: за супрацоўніцтва ў камуністычным друку, за рэвалюцыйна-прапагандысцкую работу ў Вільні і на Навагрудчыне, за антырэлігійныя творы і антыдзяржаўную дзейнасць. Ды зламаць камсамольца-падпольшчыка не ўдаецца. З-пад яго пяра з'яўляюцца новыя і новыя вершы пра землякоў-беларусаў, якія не хочуць жыць пад панскай уладай. |
| 1936 г. | Выйшла першая кніжка паэта „На этапах“. Прадмову да зборніка напісаў Р. Р. Шырма. |
| 1937—1938 гг. | Першая ластаўка — „На этапах“ — зрабіла вясну ў творчасці Максіма Танка. За ёй з'яўляюцца кнігі „Журавінавы цвет“, „Нарач“, „Пад мачтай“. |
| 1939 г. | Збываецца мара паэта і яго землякоў: Заходняя Беларусь уз'ядналася з БССР. Максім Танк працуе ў абласной газеце „Вілейская праўда“. |
| 1940 г. | Пераезд у Беласток. Напружаная літаратурная работа. У свет амаль адначасова выходзяць „Выбраныя вершы“ (Мінск) і „Стихотворения“ (Масква). |
| 1941 г. | З першых дзён вайны паэт знаходзіцца ў Чырвонай Арміі. Працуе ў газеце „За Савецкую Беларусь“, а пасля — у агітплакаце „Раздавім фашысцкую гадзіну“. |
| 1943 г. | Гэты год Максім Танк называе самым знамянальным у сваім жыцці: паэт уступае ў рады ВКП(б). Выходзіць з друку паэма „Янук Сяліба“. |
| 1945—1948 гг. | Вярнуўшыся ў Мінск, Максім Танк актыўна і плённа працуе. Выдаюцца яго кнігі „Вастрыце зброю“ і „Праз вогненны небасхіл“, „Выбраныя вершы“ і „Вершы“, зборнік „Каб ведалі“. |
| 1949 г. | У складзе савецкай дэлегацыі змагароў за мір і дружбу паміж народамі Максім Танк прымае ўдзел у рабоце Пражскага Сусветнага Кангрэсу прыхільнікаў міру. |
| 1951—1966 гг. | Па-партыйнаму ацэньваючы шматграннае жыццё нашага часу, паэт піша на самыя разнастайныя тэмы. Сведчанне гэтаму — яго кнігі „На камні, жалезе і золаце“ (1951 г.), „След бліскавіцы“ (1957 г.), збор твораў у двух тамах (1959 г.), „Мой хлеб надзённы“ (1962 г.), „Лірыка“ (1963 г.), „Глыток вады“ (1964 г.), „Наш хлеб насушчны“ (1965 г.), збор твораў у чатырох тамах, тамы 1, 2 (1966 г.). |

Максім Танк з 1949 года працуе галоўным рэдактарам часопіса „Полымя“. Як дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, кандыдат у члены ЦК КПБ, член Савецкага камітэта прыхільнікаў міру, намеснік старшыні Таварыства савецка-польскай дружбы, старшыня беларускага аддзялення Таварыства савецка-польскай дружбы, член беларускай секцыі Савецкага камітэта па культурных сувязях з суайчыннікамі за рубяжом, член прэзідыума Саюза пісьменнікаў БССР і член праўлення Саюза пісьменнікаў СССР, паэт вядзе вялікую грамадскую работу. За літаратурную і грамадскую дзейнасць Максім Танк узнагароджан двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэнам Леніна.



Хата, у якой нарадзіўся М. Танк.

Простае шчасце людское,
Так, як і наша з табою,

Пэўна, складаецца з солі,
З хлеба, сабранага ў полі,

З поту, дарожнага пылу,
З роднага небасхілу,

З дружбы, мацнейшай ад смерці,
З песні... І так мне здаецца:

Каб з чаго іншага скласці,
Дык ці было б яно шчасцем.

*(„Шчасце“, 1960)*



М. Танк і М. Лынькоў на сустрэчы з чытачамі.



У сузор'і
Савецкіх рэспублік, сябры,
І мой край
Пяцікутнаю зоркай гарыць.
Ён ляжыць на ўзбярэжжы
Дняпра і Дзвіны,
Там, дзе чуецца
Гул белавежскай сасны,

Дзе бясконцыя стужкі
Вясёлак, шляхоў,
На калгасных палях
Табуны трактароў,
Дзе для дум сакаліных —
Высокі палёт,
Дзе жыве працавіты
І мужны народ.

*(„Мой край“, 1949)*



Якое светлае, сябры,
На долю выпала нам шчасце!
Дажыць да казачнай пары,
Да камунізма шлях пракласці

І крочыць з партыяй сваёй
Да слаўнай і вялікай мэты,
Узняўшы светлаю зарой
Сцяг волі, міру па-над светам.

Няхай жаззяе у вяках
Масква — свабоды, шчасця горад,
Масква — непераможны сцяг
І міру вечная апора!

*(„Масква“, 1949)*

Тут Ленін быў. Тут шмат слядоў яго
Ля шалаша, ля гэтых берагоў
Шырокага Разліва...
...Адгэтуль ён у свет даўно пайшоў.
Быў у Кастрычніцкія дні у Смольным,
І з партыяй да перамогі вёў
Народы шматмільённыя Расіі.
Спытай індусаў. Ён над Гангам сінім,
Адкажуць, быў. Спытай у кулі.
Ён і да іх прыходзіў у Шанхай,
Наведаў сёлы, гарады, аулы,
Наведаў нават самы дальні край...
І ўсюды, дзе вялікі Ленін быў,
Народ прыгнечаны ўздымаў сцяг барацьбы.

*(„Разліў“, 1947)*



— Я, стары, таксама з-пад страхі
сялянскай,
Быў і там, дзе сёння твой гаруе сын...
Шмат слядоў пакінуў на дарогах
гразкіх,
На скрыпучых струнах белых палазін...
І стары ўздымае выцвілыя вочы:
— Ну, скажы, ці доўга гэта будзе так?
Сеяць усё сеем — з рана да паўночы,
А з бяды не можам выбрацца ніяк.

*(„Песня кулікоў“, 1936)*





Лёд уцякаў
з-пад цяжкіх ног салдат.
Фашысты, бродзячы ў вадзе, назад
Вярталіся.
— Тут не пяройдзе чорт! —
Сварыўся камендант.
— Хутчэй скажы
Ёй, стараста, каб паказала брод,
А то нам мала застанецца жыць!..

Але Гарыдавец у гэты час,
Сам праваліўшыся, з вады пачаў
На лёд вылазіць,
крыгу ж, на якой
Была Раіна,
аддзяліла тонь
І, закружыўшы, вымчала з вадой
Да берага другога,
да кустоў.

*(„Янук Сяліба“, 1943)*



Афрыка!
Вось ён — нязведаны свет,
Чорны, як порах, сухі кантынент!
Чорны ад лютага ветру сірока,
Чорны ад каланіяльнага змроку,
Чорны ад ран і слядоў бізуноў,
Чорны ад гневу мільёнаў рабоў!

Толькі не доўга ўжо быць яму чорным,
Порах заўжды загараецца ў горах,
Змоўкне сірока і ўстане пасеў.
Змрок прад зарою світальнай знікае,
Гора мільёнаў агонь высякае,
Стане чырвоным зняволеных гнеў!

*(„Гібралтар“, 1957)*

НАГЛЯДНЫ ВУЧЭБНЫ ДАПАМОЖНІК ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ
ЗАЦВЕРДЖАН МІНІСТЭРСТВАМ АСВЕТЫ БССР

Склаў Я. Н. Рапановіч
Ілюстрацыі Г. Я. Скамарохава
Рэдактар У. А. Сарока
Мастацкі рэдактар В. П. Бязмен

Выдавецтва „Народная асвета“ Камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР, Мінск, Ленінскі праспект, 83а

Надрукавана на паліграфічным камбінаце імя Я. Коласа Камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР, Мінск, Чырвоная, 23.

АТ 03624. Падпісана да друку 19/IX-1966 г. Фармат паперы 84×108. Тыраж 7500 экз. Цана 20 кап. Заказ 1456.